**2025 г. - 560 гадоў з часу першага пісьмовага згадвання Свята-Спаскага жаночага манастыра ў г. Кобрыне (1465), помніка архітэктуры барока**



Спаскі манастыр г. Кобрына — найбольш старажытны помнік праваслаўнага царкоўнага будаўніцтва, адно з найстаражытнейшых мясцін Беларусі. Размешчаны на левым беразе р. Мухавец. Да нашых дзён захаваўся келейны двухпавярховы манастырскі корпус (вул. 17 Верасня, 11 - былая Базыльянская).

Галоўнымі будаўнікамі і ктытарамі (заснавальнікамі) манастыра былі Гедымінавічы. Першае пісьмовае згадванне аб манастыры датуецца кастрычнікам 1465 года, калі княгіняй Кобрынскай Ульянай і яе сынам Іванам манастыру былі адпісаны ахвяраванні. Упамінаецца як мужчынскі манастыр пры драўлянай царкве Святога Спаса. Князі-заснавальнікі шчодра надзялілі манастыр землямі і данінай.

На падставе інвентарнага апісання, зробленага ў 1549 годзе баярынам Сямёнам Ясковічам Прышыхвосцкім па загаду каралевы Боны, можна меркаваць, што ў манастырскай царкве Св. Спаса захоўваліся вялікія каштоўнасці. Акрамя розных культавых прадметаў, былі абразы, пісаныя па залатым фоне з падвескамі з срэбных вітых грыўняў і каштоўных каменёў; размяшчалася бібліятэка рэдкіх кніг: Евангелле старажытнага пісання, першыя друкаваныя кірыліцай кнігі - «старадрукі». Інвентар манастыра 1549 года надрукаваны ў 6-м томе «Актаў Віленскай археалагічнай камісіі», адзначаны ў «люстрацыі» 1563 года каралеўскага рэвізора Дзмітрыя Сапегі. На пачатаку XVI стагоддзя манастыр ужо меў цагляныя жылыя і службовыя карпусы, капліцу.

За шматвяковую гісторыю былі ў манастыра і перыяды росквіту, і часы заняпаду і разбурэння. Пасля Брэсцкага сабора 1596 года, на якім была заключана царкоўная ўнія, манастыр стаў Базыльянскім (уніяцкім). Базыльянскай назвалі і манастырскую вуліцу. З тых часоў Кобрын і манастыр часта становяцца месцам сходаў і нарад уніятаў. У 1626 годзе ў манастыры праходзіў Кобрынскі царкоўны сабор вышэйшага ўніяцкага духавенства. Сённяшнюю будову манастыр меў не заўсёды. Ён шмат разоў гарэў, перабудоўваўся, а сучасны выгляд набыў прыкладна ў канцы XVIII стагоддзя.

Падчас вайны 1812 года, калі войскі Напалеона знаходзіліся ў Кобрыне, манастыр быў пераўтвораны ў магутны рэдут. Знамянальны бой на ганку манастыра завяршыўся капітуляцыяй ворага і палонам напалеонаўскіх салдат. Галоўны корпус ацалеў тады цудам.

У верасні 1830 года ў манастыры адкрылася павятовае духоўнае вучылішча, асноўнай мэтай якога была падрыхтоўка хлопчыкаў да паступлення ў духоўную семінарыю. Са сцен установы выйшлі будучыя навукоўцы і краязнаўцы. У 1839 годзе, пасля адмены ўніі, манастыр закрылі. Пабудовы засталіся ў распараджэнні духоўнага вучылішча, а Спаса-Праабражэнская царква, якая займала два паверхі ў галоўным корпусе, стала дамавой, прызначанай для выхаванцаў і выкладчыкаў вучылішча. У 1872 годзе сінадальным указам вучылішча пераведзена ў мястэчка Жыровічы, а манастырскія памяшканні перададзены ў распараджэнне мясцовага духавенства.

Далейшая гісторыя манастыра сумная. Паводле даследаванняў былога дырэктара кобрынскага музея, краязнаўца А. М. Мартынава, пажар 1895 года, а таксама войны пачатку XX стагоддзя знішчылі манастырскія будынкі, пакінуўшы толькі цагляную каробку з вялікім склепам.

Пасля пажару будынак доўгі час стаяў напаўразбураным. У сярэдзіне 1920-х гадоў польскай адміністрацыяй было прынята рашэнне адрэстаўрыраваць векавыя сцены для наступнага размяшчэння ў іх павятовага суда. Аднаўленчыя работы суправаджаліся чарговай вельмі істотнай перапланіроўкай інтэр’ера. На гэты раз цалкам зніклі сляды былога храма, які займаў калісьці цэнтральную частку будынка. З 1923 года па 1939 год у манастырскім корпусе размяшчаўся павятовы суд, з 1939 года па 1962 год будынак займалі камунальнікі, пасля - раённы аддзел унутраных спраў, які знаходзіўся тут больш 50 гадоў. Былы манастыр быў капітальна адрамантаваны і прыстасаваны для патрэбы РАУС. Характар работ дыктаваўся ўтылітарнымі меркаваннямі, значна памянялася ўнутраная планіроўка, новае аблічча набыў фасад, у выніку мастацкай каштоўнасці будынка быў нанесены ўрон.

У чэрвені 2010 года памяшканне было перададзена Брэсцкай епархіі, па благаславенні Сінода Беларускай Праваслаўнай Царквы манастыр адраджаецца, але ўжо як жаночы манастыр Усяміласцівага Спаса. 6 чэрвеня 2011 года

прыбылі першыя насельніцы — тры сястры на чале з ігуменіяй Еўфрасінняй (Куракевіч). 10 чэрвеня адбылася першая пасля шматгадовага перапынку Боская Літургія.

У наш час у манастыры знаходзяцца 13 насельніц. У абіцелі пабудавана дамавая царква ў гонар абраза Божай Маці «Скорапаслушніца», дзе рэгулярна здзяйсняюцца набажэнствы. Галоўная святыня – цудатворная ікона Божай Маці «Скорапаслушніца» – створана спецыяльна для манастыра на святой гары Афон. Пры манастыры дзейнічаюць нядзельныя школы для дзяцей і дарослых, дзіцячая студыя дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Арганізавана і здзяйсняе сваю справу сястрыцтва. Наладжана ў манастыры і падсобная гаспадарка: закладзены манастырскі сад, агарод, уладкаваны птушнік, пасека, зарыблена сажалка. Выпякаецца хлеб, працуе рукадзельная.

Да 550-годдзя манастыра пабачыла свет кніга «Обитель Спаса Всемилостивого» (2015), якая ўключае шматлікія дакументальныя матэрыялы. У 2020 годзе завершаны работы па капітальным рамонце галоўнага гістарычнага корпуса манастыра і добраўпарадкаванні тэрыторыі. У 2022 годзе пачата будаўніцтва храма Усеміласцівага Спаса.

Келейны корпус манастыра – помнік архітэктуры барока, уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (112Г000386). Вярнуўшыся пад юрысдыкцыю царквы, гэты старадаўні куток Кобрына не страціў свой найбагацейшы турыстычны патэнцыял, прывабнасць для вандроўнікаў розных канфесій, бо з ім злучана шмат гістарычных падзей.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай бібліятэчнай сістэмай. Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

**Ярашэвіч, А.** Кобрынскі Спаскі манастыр / А. Ярашэвіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. – С. 371.

**Кобрынскі** Спаскі Манастыр // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1997. – Т. 4. - С. 222.

**Габрусь, Т. В.** Кобрынская Мікалаеўская царква ; Кобрынскі Спаскі манастыр / Т. В. Габрусь, Т. І. Чарняўская // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 89.

**Габрусь, Т.** Кобрынскі Спаскі манастыр / Тамара Габрусь // Вялікае княства Літоўскае : энцыклапедыя : у 2 т. - Мінск, 2007. - Т. 2. - С. 118.

**Кулагін, А.** Свята-Спаскі манастыр / А. Кулагін // Праваслаўныя храмы Беларусі : энцыклапедычны даведнік / А. Кулагін. – Мінск, 2007. – С. 202-203.

**Кулагін, А. М.** Свята-Спаскі манастыр // Праваслаўныя храмы на Беларусі : энцыклапедычны даведнік / А. М. Кулагін. - Мінск, 2001. - С. 102-103 : фат.

**Обитель Спаса Всемилостивого**. К 550-летию Спасского монастыря в г. Кобрине (1465-2015) / сост. игумения Евфросиния (Куракевич). – Минск, 2015. – 64 с.

**Барысюк, Ю. А.** Свята-Спаскі манастыр / Ю. А. Барысюк // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 460-461. - (Праваслаўнае мураванае дойлідства).

**Кобрын**: гістарычная і архітэктурная спадчына. [Спаскі манастыр] // Кобрын: мінулае і сучаснае. – Брэст, 2020. - С. 54 : фат.

**Кобринский** район. Кобрин. Спасский монастырь // 100 достоприме-чательностей Брестчины. – Брест, 2019. – С. 44.

**Комплекс** Спасского женского монастыря // Храмы Брестчины. – Брест, 2024. - С. 113 : фот.

**Мароз, В. В.** Кобрын / В. В. Мароз // Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны : нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. В. Мароз. – Мінск, 2018. - С. 44-48.

**Мешечко, Е. Н.** Монастыри Брестской области [Женский монастырь во имя Всемилостивого Спаса] / Е. Н. Мешечко // Путешествие по Беларуси. В краю Немана, Западного Буга и Припяти : путеводитель / Е. Н. Мешечко. – Брест, 2012. – С. 140.

**Монастырь** // По земле кобринской. Туристические маршруты : справочное издание. - Барановичи, 2004. – С. 8 : фот.

**Чарняўская, Т. І.** Спаскі манастыр **/** Т. І. Чарняўская // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. – С.226.

**Чернявская, Т. И.** Спасский монастырь / Т. И. Чернявская // Свод памятников истории и культуры Белорусии. Брестская область. – Минск, 1990. – С. 251, 252.

**Манастыр** у імя Усяміласцівага Спаса : краязнаўчы буклет / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнік С. Д. Курачук ; дызайн П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2020.

**Свята-Спаскаму** манастыру ў г. Кобрыне (1465) - 560 гадоў // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 185.

**Время д**обрых дел / по информации Спасского женского монастыря г. Кобрина // Кобрынскі веснік. – 2025. – 29 сакавіка (№ 13). – С. 12.

В Спасском женском монастыре г. Кобрина проходит благотворительная акция «Яичко ко Христову дню».

**Святки** – время добрых дел / по информации spaskobrin.by. // Кобрынскі веснік. - 2024. — 27 студзеня (№ 4). — С. 12 : фот.

Спасский женский монастырь города Кобрина принял участие в благотворительной акции «Дары волхвов».

**Елизарова, Ж.** Тропа к духовным родникам / Жанна Елизарова ; фото из архива Спасского женского монастыря // Кобрынскі веснік. - 2023. — 19 жніўня (№ 55). — С. 12 : фот.

В Спасском женском монастыре православные молитвенно отметили престольный праздник — день Всемилостивого Спаса.

**Елизарова, Ж**. Небесные корабли спасения. Таямніцы зямлі кобрынскай / подготовила Жанна Елизарова ; по материалам интернет-порталов «Познай Кобрин», «RETRO-КОБРИН-CITY», библиотеки ГУ «Кобринский военно-исторический музей им. А. В. Суворова» // Кобрынскі веснік. - 2022. — 23 лютага (№ 14). — С. 4—5 : фот.

Первая статья из цикла материалов «Таямніцы зямлі кобрынскай» рассказывает о Спасском монастыре, Александро-Невском соборе и Свято-Никольском храме.

**Свірыдовіч, В.** У кожнага свая святыня. Кобрын. Адраджэнне царквы - сапраўдны цуд / Вольга Свірыдовіч ; фота Валерыя Караля і з адкрытых інтэрнэт-крыніц // Заря. – 2022. - 27 жніўня (№ 68). – С. 12. – (Наш праект «Бацькаўшчына»).

**Сергеев, И**. Будет новый храм / Иван Сергеев // Кобрынскі веснік. – 2022. – 10 жніўня (№60). – С. 6.

В Кобрине продолжается строительство храма Всемилостивого Спаса на территории Спасского монастыря.

**Четыре** дня в монастыре / фото с сайта pravbrest.by // Заря. – 2022. – 13 июля (№ 55). – С. 19 : фот.

В Спасском женском монастыре работал лагерь дневного пребывания для воспитанников старшей возрастной группы воскресной школы обители.

**Архиепископ** Иоанн совершил молебное пение на начало строительства главного храма монастыря Всемилостивого Спаса в г. Кобрине / пресс-служба Брестской епархии // Кобрин-информ. – 2021. -11 ноября (№ 45). – С. 11 : фот.

**Елизарова, Ж.** Молитва, песнопение, любовь / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2021. – 25 жніўня (№ 67). – С. 8 : фот.

В Спасском женском монастыре состоялся концерт духовной музыки и слова, приуроченный к престольному празднику.

**Игумения** Евфросиния приняла участие в торжествах в честь 30-летия обретения мощей праведного Иоанна Кормянского // Кобрин-информ. – 2021. – 10 июня (№ 23). – С. 11 : фот.

**Спасский** монастырь отметил престольный праздник // Кобрин-информ. – 2021. – 19 августа (№ 33). – С. 13 : фот.

**Вовк, Ю.** По зову сердца: сестры милосердия / Юлия Вовк // Кобрин-информ. – 2020. – 30 апреля (№ 18). – С. 11.

О православном сестричестве в честь иконы Божией Матери «Скоропослушница» при Спасском женском монастыре.

**Елизарова, Ж**. Церковный собор проходил в Кобрине / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2020. – 7 кастрычніка (№ 78). – С. 4.

Церковный собор высшего униатского духовенства Речи Посполитой проходил в Кобринском Спасском монастыре в сентябре 1626 г.

**Издана** книга о Спасском монастыре г. Кобрина «Обитель Спаса Всемилостивого. Исторический очерк. Возрождение» // Кобрин-информ. – 2020. – 13 августа (№ 33). – С. 11.

**Спасская** обитель // Заря. – 2020. – 12 августа (№ 65). – С. 20.

Женский монастырь во имя Всемилостивого Спаса в г. Кобрине отметит сразу две даты: 555 лет со времени первого письменного упоминания об обители и 10-летие возобновления здесь монашеской жизни.

**555-летие** со дня основания Спасского женского монастыря г. Кобрина // Кобрин-информ. – 2020. – 20 августа (№ 34). – С. 13.

**Воспитанники** воскресной школы совершили паломничество // Кобрин-информ. – 2019. – 6 июня. – С. 12.

Состоялась паломническая поездка учащихся воскресной школы при Спасском монастыре г. Кобрина.

**Щедрая** «Ладошка» // Заря. – 2018. – 12 декабря. – С. 17.

Работы воспитанников при воскресной школе Спасского женского монастыря признаны лучшими на Международном фестивале социальной рекламы в защиту жизни и семьи «Ладошка».

**Игумения** Евфросиния приняла участие в работе монашеской конференции // Кобрин-информ. – 2017. – 23 ноября. – С. 11.

**Цвирко, В.** 150 золотых маршрутов моей Беларуси: Кобрин : авторский проект Владимира Цвирко / Владимир Цвирко ; материал подготовила Юлия Лабецкая // 7 дней. - 2017. — 14 декабря. — С. 24, 25.

Архитектурные достопримечательности г. Кобрина, в т. ч. Спасский монастырь.

**Васюк, Н.** Здесь вечный след / Наталья Васюк // Вечерний Брест. - 2016. — 7 января. — С. 3.

История возрождения женского Спасского монастыря г. Кобрина.

**Новое** издание Спасского монастыря // Кобрин-информ. – 2016. – 19 мая. – С. 10.

Изданы материалы научно-практической конференции, приуроченной к 550-летию со времени первого письменного упоминания о Спасском монастыре.

**Дубина, Л.** Обитель с большой историей / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. – 2015. – 21 лістапада. – С. 1,2.

Кобринскому Спасскому монастырю исполнилось 550 лет.

**Литвинович, Е.** Пять веков истории / Евгений Литвинович // Заря. – 2015. – 28 февраля. – С. 8.

В нынешнем году исполняется 550 лет с момента первого письменного упоминания о Спасском монастыре.

**Марчук, Н.** Из истории Спасского монастыря / Нина Марчук // Кобрин-информ. – 2015. – 14 мая. – С. 11.

К 550-летию Спасского монастыря.

**Монастырь** перешагнул столетие // Вечерний Брест. - 2015. — 20 ноября. — С. 5.

Спасский монастырь в Кобрине отмечает 550-летие.

**Спасский монастырь** в Кобрине // Заря. – 2015. – 13 августа. – С. 17.

Статья посвящена женскому Спасскому монастырю, который празднует 550-летие со времен своего основания.

**Выпускной** в воскресной школе // Кобрин-информ. – 2014. – 29 мая. – С. 10 : фот.

25 мая 2014 г. в Спасском монастыре состоялся первый выпуск слушателей детской воскресной школы по трёхгодичному курсу обучения.

**Казакова, А.** Школа любви и просвещения : к 550-летию Спасского монастыря / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2014. — 13 февраля. — С. 9.

**Казакова, А.** Главная Святыня / Анна Казакова // Кобрин-информ. – 2014. – 29 мая. – С. 10 : фот.

Список «Чудотворной иконы Божией Матери «Скоропослушница» хранится в Спасском монастыре г. Кобрина.

**Леанавец, Н.** Каменныя сведкі духоўнасці **/** Ніна Леанавец // Народная трыбуна. – 2014. – 4 ліпеня. - С. 9.

Спаскаму манастыру ў Кобрыне – 550 гадоў.

**Марчук, Н.** Храмы Спасского монастыря / Нина Марчук // Кобрин-информ. — 2014. — 18 сентября. — С. 11.

На территории Спасского монастыря когда-то действовали Преображенская и Кирилло-Мефодиевская церкви.

**Арлова, І.** Вяртанне святыні / Ірына Арлова // Народная газета. – 2012. – 10 студзеня. – С. 7.

Манастыр у імя Усяміласцівага Спаса адраджаецца ў Кобрыне.

**Занько, Н.** Малітвенны шчыт манаства / Настасся Занько // Кобрынскі веснік. - 2012. - 7 красавіка. - С. 10.

У Кобрыне аднавілася дзейнасць Спаскага манастыра

**Вержбицкая, В.** Афонский дар кобринскому монастырю / Виктория Вержбицкая // Кобрин-информ. – 2011. – 24 ноября. – С. 28.

22 ноября в Кобринский Спасский монастырь прибыла святыня - точный список чудотворного образа Богоматери «Скоропослушница», который подарен афонским Дохиарским монастырем.

**Вержбицкая, В.** Возрождение Спасской обители / Виктория Вержбицкая // Кобрин-информ. - 2011. - 16 июня. - С. 28.

**Жук, Е.** Чудо возрождения / Елена Жук // Вечерний Брест. – 2011. – 11 февраля. – С. 6.

Летопись Спасской обители богата событиями.

**Занько, Н.** У Спаскі манастыр прыбыла ікона з грэчаскага Афона / Настасся Занько // Кобрынскі веснік. – 2011. – 26 лістапада. – С. 4.

Спісак з афонскай іконы Божай Маці “Скорапаслушніца” прыбыў у Кобрын 22 лістапада.

**Новые страницы** монастырской летописи // Кобрин-информ. – 2011. – 3 февраля. – С. 28.

История Спасского монастыря.

**Васюк, Н.** Обитель родом из средневековья / Наталья Васюк // Вечерний Брест. - 2010. - 13 октября. - С. 16.

В Кобрине планируют открыть женский монастырь.

**Мартынов, А.** Свидетель нашей истории / А. Мартынов // Кобрынскі веснік. – 1997. – 12 красавіка. – С. 2.

Спасский монастырь.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Кобрын

***Помнікі:***

Кобрынскі Спаскі жаночы манастыр

***Прадметы:***

Манастыры

Помнікі культавай архітэктуры